ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі ЎНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 4 (761) • Пятніца, 30 студзеня 1970 г. Цана 2 кап. Год выдання XXIII

**ЦЯПЕР У САВЕЦКІМ САЮЗЕ ДЗЕЙНІЧАЕ БОЛЬШ 20 ЗАВОЧНЫХ ВНУ, КАЛЯ 600 ЗАВОЧНЫХ АДДЗЯЛЕННЯЎ ПРЫ ЎНІВЕРСІТЭТАХ, ІНСТЫТУТАХ І АКАДЭМІЯХ. ЗАВОЧНЫМ НАВУЧАННЕМ АХОПЛЕНА БОЛЬШ МІЛЬЁНА ЧАЛАВЕК. ШТОГАДОВЫ ВЫПУСК ЗАВОЧНЫХ ВНУ І АДДЗЯЛЕННЯЎ СКЛАДАЕ БОЛЬШ 100 ТЫСЯЧ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ ВЫШЭЙШАЙ КВАЛІФІКАЦЫІ.**

СЁННЯШНІ НУМАР ПРЫСВЯЧАЕЦЦА ЗАВОЧНАМУ ФАКУЛЬТЭТУ. МАТЭРЫЯЛЫ ГАЗЕТЫ РАСКАЗВАЮЦЬ АБ ВУЧОБЕ І ПРАЦЫ СТУДЭНТАЎ, АБ ПЛАНАХ І МЕРКАВАННЯХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ — АБ УСІМ, ШТО ХВАЛЮЕ СЁННЯ КАЛЕКТЫЎ ЗАВОЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА.

## ЛЕПШ ПРАЦАВАЦЬ, ЛЕПШ ВУЧЫЦЦА

З году ў год пашыраецца сістэма завочнага навучання ў нашым універсітэце. Калі ў 1945-46 навучальным годзе на ўсіх спецыяльнасцях завочнага факультэта вучылася толькі 525 чалавек, то цяпер колькасць студэнтаў павялічылася ў 9 разоў і складае больш чатырох з палавінай тысяч. Падрыхтоўка вядзецца па 10 спецыяльнасцях. Станоўчым з'яўляецца тое, што большасць навучэнцаў працуе па выбранай спецыяльнасці.

Рэктарат, дэканаты і кафедры галоўную ўвагу ўдзяляюць паляпшэнню якасці падрыхтоўкі спецыялістаў. Улічваючы, што якасць падрыхтоўкі ў многім залежыць ад пастаноўкі выкладання, вялікая работа праводзіцца па забеспячэнню завочнага факультэта высокакваліфікаванымі кадрамі. Пры планаванні і размеркаванні вучэбнай нагрузкі кафедры імкнуцца захаваць пастаянны састаў выкладчыкаў і выдзеліць, асабліва для чытання лекцыйных курсаў, найбольш кваліфікаваных і вопытных таварышаў.

У мінулым годзе са студэнтамі-завочнікамі працавала 630 выкладчыкаў, у тым ліку 45 прафесараў і дактароў навук і больш 300 дацэнтаў і кандыдатаў навук. Большасць загадчыкаў кафедр асабіста вядзе выкладчыцкую работу са студэнтамі-завочнікамі.

На пасяджэннях вучоных саветаў, кафедр сталі часцей абмяркоўвацца пытанні вучэбнай і метадычнай работы. Узмацніўся кантроль за якасцю правядзення заняткаў. Больш практыкуецца наведванню і ўзаеманаведванню заняткаў, адкрытых лекцый, абмеркаванню тэкстаў лекцый. Вынікі наведвання і ўзаеманаведвання заняткаў абмяркоўваюцца на пасяджэннях кафедр. Ужо пачынае ўваходзіць у сістэму правядзенне групавых і тэматычных кансультацый з выклікам на іх студэнтаў. Кафедры сталі часцей заслухоўваць справаздачы выкладчыкаў аб рабоце са студэнтамі-завочнікамі, зацвярджаць тэматычныя планы лекцый, лабараторных і семінарскіх заняткаў.

Некалькі палепшылася метадычная работа кафедр. Толькі за мінулы навучальны год падрыхтавана прафесарска-выкладчыцкім саставам універсітэта 40 вучэбна-метадычных распрацовак і больш 200 тэматык кантрольных і курсавых работ з метадычнымі ўказаннямі. На многіх кафедрах створаны метадычныя секцыі па пытаннях завочнага навучання. На радзе кафедр праводзяцца калёквіумы па найбольш складаных і цяжкіх курсах тэмы.

У выкладанні многіх прадметаў сталі часцей выкарыстоўвацца тэхнічныя сродкі і наглядныя дапаможнікі. Так, на лекцыях па цыталогіі дэманструецца вучэбны фільм «Мітоз», які паказвае складаныя працэсы, што адбываюцца ў клетцы пры літатычным дзяленні. На кафедры фізіялогіі чалавека і жывёл пры чытанні лекцый выкарыстоўваюцца кінафільмы аб работах Паўлава па вышэйшай нервовай дзейнасці і г. д.

Для замацавання матэрыялу па найбольш складаных тэмах студэнтам-географам па курсу «Ахова прыроды і краязнаўства» дэманструюцца фільмы «У глыбіні гор», «Працаўнікі лесу» і іншыя.

На кафедрах гісторыі КПСС у час лекцый і семінарскіх заняткаў шырока выкарыстоўваюцца магнітафонныя запісы выступленняў У. І. Леніна, дэманструюцца дакументальныя фільмы.

Вялікую дапамогу студэнтам-завочнікам аказваюць вучэбныя перадачы па тэлебачанню, у якіх прымаюць удзел і выкладчыкі ўніверсітэта. Увайшло ў традыцыю штомесячнае правядзенне дня завочніка. Усе гэтыя і іншыя меры дапамагаюць большасці завочнікаў атрымаць грунтоўныя веды і паспяхова здаць экзамены ў зімовую і летнюю лабараторна-экзаменацыйныя сесіі.

У час летняй сесіі паспяховасць студэнтаў-завочнікаў склала 70,2 працэнта. Больш 500 чалавек здалі экзамены на добра і выдатна.

*(Працяг на 2-й стар.).*



**Вельмі прыемна, калі экзамен прыносіць задавальненне і выкладчыку, і студэнту. Якраз такі выпадак падпільнаваў наш фотакарэспандэнт Д. ЧАХОВІЧ.**

**НА ЗДЫМКУ: выкладчык В. М. САЎЛЬЧАНКА прымае экзамен па навуковаму камунізму ў студэнта матфака В. В. ТАЯНОЎСКАГА.**

## *ВЕДЫ—АДЗНАКА*

«Ціха, ідуць экзамены!» Здаецца, што гэтыя словы заклікаюць не толькі спыніць гаворку, заглушыць шум крокаў. Гэтым аддаецца пашана экзамену, выкладчыку, тым студэнтам, якія здаюць яго.

Мы пабывалі на экзамене па навуковаму камунізму ў завочнікаў шостага курса факультэта журналістыкі.

Нягледзячы на сталы ўзрост, гэтыя шмат пабачыўшыя студэнты хваляваліся каля дзвярэй, курылі цыгарку за цыгаркай.

Традыцыя першай пяцёркі і ў дадзеным выпадку была непарушнай. І гэта зразумела. Хто лепш засвоіў матэрыял, таму хутчэй узнавіць яго ў памяці, ён заўсёды адказвае першым. На гэтым экзамене першым быў журналіст Генадзь Карабіцкі. За ім ішлі Анатоль Скробат, Аляксандр Дземідовіч, Мікалай Кернога, Мікалай Варакса. Выкладчык — кандыдат філасофскіх навук Міхаіл Iвгавіч Бароўскі— вельмі задаволен сваімі студэнтамі.

— Ведаеце, пра журналістаў ідуць размовы, што ў іх шмат слоў, а мала справы... Тут мы назіраем адваротную з'яву.

Выкладчыку спадабалася грунтоўнасць, лагічнасць будовы адказаў. Асабліва Міхаіл Іванавіч выдзеліў уменне журналістаў выкрышталізаваць з вялікага мноства матэрыялу галоўную, канкрэтную думку.

Між іншым, выкладчык зазначыў, што і ў гэтай, на яго думку, нядрэнна падрыхтаванай групе ёсць свае слабыя бакі: так, матэрыял апошніх лекцый часта заставаўся па-за ўвагай студэнтаў; здаралася іншы раз, што побач з грунтоўнай агульнай падрыхтоўкай выяўлялася вельмі прыблізнае веданне канкрэтнага матэрыялу, першакрыніц і інш.

Тым не менш журналісты паспяхова здаюць сваю апошнюю сесію.

**А. СЛУКА,**
**аспірант факультэта журналістыкі.**



**Экзаменацыйная сесія на завочным факультэце супала з Усесаюзным перапісам насельніцтва, і трэба было прыкласці нямала старання, каб ні адзін чалавек не застаўся па-за ўвагай перапісчыкаў.**

**НА ЗДЫМКУ: А. Н. СЯКЕРЫНА завяршае перапіс на завочным факультэце.**

Фота **Д. ЧАХОВІЧА.**

## ЗАВОЧНІКІ—НАРОД СУР'ЁЗНЫ

Завочнае навучанне — форма атрымання вышэйшай адукацыі, якая цалкам сябе апраўдала за доўгія гады існавання. Як правіла, завочнікі — людзі, якія маюць прагнае жаданне вучыцца, але па тых ці іншых прычынах не могуць гэта зрабіць без адрыву ад вытворчасці.

Ёсць яшчэ некалькі асаблівасцей, якія вызначаюць завочнае навучанне. Завочнік — часцей за ўсё чалавек, старэйшы па ўзросту, больш узбагачаны жыццёвым вопытам, чым яго аднакурснікі на стацыянары. Завочнік мае багацейшыя спецыяльныя веды, чым яны. І, нарэшце, тыя веды, якія набываюць завочнікі, здабываюцца імі пераважна шляхам самастойнай работы над кнігай. А такія веды найбольш трывалыя, а значыць, і каштоўныя.

Я даўно працую на завочным факультэце і задаволен гэтай працай. Большасць студэнтаў вельмі сур'ёзна адносіцца да лекцый і да тых заданняў, якія ім даюцца. Хацелася б сказаць і аб тым, што некаторыя дыпломныя работы выпускнікоў-завочнікаў аддзялення беларускай мовы і літаратуры нават лепшыя, чым адпаведныя работы на стацыянары.

Мне самому давялося быць студэнтам-завочнікам БДУ імя У. І. Леніна. Гэта былі першыя пасляваенныя гады. З тагачасных завочнікаў большасць змагалася на франтах Айчыннай вайны і ў партызанскіх атрадах. За час вайны гэтыя людзі, школьны ўзрост якіх даўно мінуў, моцна засумавалі па кнізе, па навуцы. З якой увагай яны слухалі лекцыі, накідваліся на кнігі, падручнікі!

Вучыцца ў той час было цяжка. Універсітэт ляжаў у руінах, меў лічаныя аўдыторыі. Мы вандравалі па мінскіх школах, лекцыі слухалі седзячы на нізенькіх партах першакласнікаў. Не хапала кніг, падручнікаў, праграм. Ды шмат чаго не хапала!.. Была вострай і праблема харчавання.

З удзячнасцю я ўспамінаю нашых прафесараў і выкладчыкаў— Саўсуна, Волчэка, М. Я. Рэзнікава, Д. Я. Фактаровіча, В. І. Сцяпанава і многіх іншых. Тады, на маю думку, кіраўніцтва ўніверсітэта вельмі добра рабіла, што прыцягвала да выкладання на завочным аддзяленні самых лепшых прафесараў і выкладчыкаў. Сёння, на жаль, мы аб гэтым часта забываем. Далёка не ўсе вядучыя прафесары і дацэнты чытаюць завочнікам. На час летняй, самай грунтоўнай сесіі яны плануюць свой адпачынак. А завочніку вельмі важна паслухаць высокакваліфікаванага выкладчыка. Гэта накіроўвае яго самастойныя разумовыя пошукі, яго работу, узнімае дух, нават працаздольнасць студэнта, які жыве далёка ад універсітэта.

**І. НАВУМЕНКА,**
**доктар філалагічных навук.**

# КАБ БЫЛО ЎСЁ ВЫДАТНА



Біяграфія Анатоля Рыгоравіча Рублеускага тыловая для многіх яго равеснікау: вучыуся, працавау, зведау рамантыку і будні далёкіх будоуляў, служыу у радах Савецкай Арміі, стаў студэнтам. Здаецца, усё проста. Аднак за кожнай вяхой біяграфіі — праца і няўрымслівасць, імкненне да ведаў і вялікае жаданне і уменне рабіць усё выдатна.

Пасля заканчэння ФЗО у г. Віцебску Анатоль едзе працаваць на галоуны Туркменскі канал, а неузабаве у ліку лепшых камсамольцау камандзіруецца на будаўніцтва Кара-Кумскай воднай артэрыі. Тут ён узначальвае брыгаду каменшчыкау, а пасля працуе майстрам. Адсюль ідзе у армію. Але і там ён працягвае вучыцца, набывае сярэднюю адукацыю, вядзе грамадскую работу, становіцца камуністам.

1961 год быу годам дэмабілізацыі і пачаткам новага перыяду вучобы: Анатоль Рублеускі паступае у Мінскую школу міліцыі імя Фрунзе, а у 1965 годзе становіцца студэнтам БДУ.

Цяпер старшы лейтэнант міліцыі, інспектар аддзела службы пазаведамаснай аховы пры МУС БССР Анатоль Рыгоравіч Рублеускі— студэнт V курса юрыдычнага аддзялення завочнага факультэта. Яшчэ у 1966 годзе за бездакорную службу яму прысвоена званне выдатніка міліцыі, і з той пары ён з гонарам яго апраудвае. А ва універсітэце аб Анатолю Рыгоравічу гавораць як аб выдатным студэнце.

# ЛЕПШ ПРАЦАВАЦЬ, ЛЕПШ ВУЧЫЦЦА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).*

Усе экзамены на выдатна здалі 36 чалавек. Сярод іх Е. Н. Барычэуская (VI курс аддзялення беларускай мовы і літаратуры), В. М. Кізіл (VI курс аддзялення журналістыкі), В. В. Вішнеускі (IV курс геаграфічнага аддзялення), В. В. Таяноускі (VI курс матэматычнага аддзялення) і іншыя.

У мінулым навучальным годзе паспяхова прайшла абарона дыпломных работ і здача дзяржауных экзаменау. З 569 студэнтаў, абараняушых дыпломныя работы, 449 чалавек атрымалі добрыя і выдатныя адзнакі. У выніку новы атрад спецыялістау папоуніў многія установы народнай гаспадаркі і культуры рэспублікі.

Аднак нас яшчэ не можа поунасцю задаволіць якасць падрыхтоукі спецыялістау па завочнай сістэме. Многія студэнты-завочнікі атрымліваюць на экзаменах нездавальняючыя адзнакі.

Высокі працэнт нездавальняючых адзнак на першым курсе філалагічнага факультэта, на другім курсе гістфака і на першым — геафака. Зусім безадказна адносяцца да вучобы ва універсітэце студэнты К. В. Камейша (V курс філфака, Ю. П. Васілеускі (II курс журфака), С. П. Гурыновіч (I курс біяфака), Е. А. Марцанюк (III курс біяфака), Н. М. Салей (I курс гістфака), В. Н. Пятроў (V курс гістфака), Б. П. Струк (III курс аддзялення матэматыкі), В. П. Гуранкоу (IV курс геафака), А. В. Троцкая (IV курс філфака) і іншыя.

Значная частка студэнтау выключаецца за непаспяховасць. Толькі за адзін мінулы год было выключана 145 чалавек, 26 пакінута на паўторны год навучання.

У чым прычыны такога становішча? На наш погляд, яны у асноўным вынікаюць з наступнага: некаторыя кафедры мала ўдзяляюць увагі арганізацыі навучальнага працэсу, даручаючь працаваць са студэнтамі-завочнікамі недастаткова вопытным выкладчыкам, што часам прыводзіць да зніжэння якасці выкладання. Так, напрыклад, на матэматычным факультэце з 36 выкладчыкаў, што працуюць са студэнтамі завочнага факультэта, няма ні аднаго доктара навук, і толькі 5 маюць вучоную ступень кандыдата навук, а з 19 асістэнтаў чытаюць лекцыі і вядуць заняткі 13 чалавек. Няма неабходнасці гаварыць аб тым, што падобнае становішча проста недапушчальнае.

З боку асобных кафедр адсутнічае кантроль за якасцю выкладання, за самастойнай работай студэнтаў. Многія студэнты слаба працуюць самастойна, асабліва у міжсесійны перыяд, глыбока не вывучаюць рэкамендаваную літаратуру, першакрыніцы, спадзеючыся вывучыць неабходны матэрыял толькі у перыяд сесіі, што прыводзіць да павярхоўнага засваення матэрыялу, да правалаў. Многія студэнты малодшых курсаў не маюць навыкаў самастойнай работы, і кафедры не аказваюць ім у гэтым неабходнай дапамогі.

Адной са спецыфічных форм вучэбнай работы ў сістэме завочнай адукацыі з'яўляюцца кантрольныя работы. У сувязі з гэтым вар та асобна падкрэсліць неабходнасць своечасовага і якаснага рэцэнзавання іх. Методыка рэцэнзавання кантрольных работ пастаянна ўдасканальваецца, і большасць студэнцкіх прац правяраецца у тэрмін і дабраякасна. Аднак бываюць і такія рэцэнзіі, якія выглядаюць фармальнай адпіскай. У іх адсутнічае аналіз выкладзенага матэрыялу, не раскрываюцца недахопы работы, не даюцца практычныя рэкамендацыі, як яе палепшыць, як больш глыбока высветліць тое ці іншае пытанне. Даволі часта на кафедрах парушаюцца тэрміны рэцэнзавання работ. Так, некаторыя кантрольныя работы па кафедрах палітэканоміі, дыямата і гістмата, гісторыі дзяржавы і права затрымліваліся па месяцу і больш. Гэтых і падобных недахопаў магло б і не быць, калі б усе кафедры выконвалі свае прамыя абавязкі— штомесячна выносілі на абмеркаванне пытанні рэцэнзавання студэнцкіх работ, абменьваліся вопытам.

Адной з сур'ёзных прычын непаспяховасці студэнтаў з'яўляецца тое, што некаторыя з іх не на поўную сілу працуюць і ў час экзаменацыйных сесій: не наведваюць лекцый, а часам на занятках займаюцца пабочнымі справамі; не рыхтуюцца да семінарскіх і практычных заняткаў, вядуць на іх сябе пасіўна, не выступаюць.

Падрыхтоўка высокакваліфікаваных спецыялістаў немагчыма без прывіцця студэнтам навыкаў навуковага даследавання. Улічваючы гэта, некаторыя кафедры прыцягваюць да навукова-даследчай работы і студэнтаў-завочнікаў: апошнія ўдзельнічаюць у навуковых гуртках, рэспубліканскіх аглядах навуковых студэнцкіх работ, навуковых канферэнцыях. У 1968 годзе было прадстаўлена на рэспубліканскі агляд 15 работ студэнтаў-завочнікаў, а ў 1969 годзе — 32. Некаторыя з іх аднесены да першай або другой катэгорыі.

Падрыхтоўка высокакваліфікаваных спецыялістаў немагчыма без іх ідэйнай загартоўкі. Дэканат, кафедры вялікую увагу удзяляюць арганізацыі у перыяд сесіі культурна-масавых і палітыка-выхаваўчых мерапрыемстваў: для студэнтаў-завочнікаў чытаюцца лекцыі аб міжнародным становішчы, арганізуюцца экскурсіі, сустрэчы з паэтамі і пісьменнікамі, вядучымі вучонымі універсітэта і г. д. Аднак гэтыя мерапрыемствы носяць яшчэ эпізадычны характар, не сталі сістэмай.

Задачы юбілейнага года патрабуюць паляпшэння усіх звенняў нашай вучэбнай і выхаваўчай работы, павышэння адказнасці усіх студэнтаў-завочнікаў.

**У. ІВАШЫН,**
прарэктар па вячэрняму і завочнаму навучанню.
**Т. ДУДАРАВА,**
дэкан завочнага факультэта.

# НЕ ТОЛЬКІ ДЛЯ ДЫПЛОМА...

Няма патрэбы даказваць, што на завочным факультэце вучыцца значна цяжэй, чым на стацыянары. Улічваючы гэта, члены кафедры рускай мовы імкнуцца выкарыстаць усе магчымасці, каб студэнты набылі трывалыя веды па сваей спецыяльнасці. Асноуная увага удзяляецца якасці выкладання курсау сучаснай рускай мовы, гістарычнай граматыкі, гісторыі літаратурнай мовы, дыялекталогіі, стылістыкі. Гэтыя курсы вядуць найбольш кваліфікаваныя дацэнты і старшыя выкладчыкі, кандыдаты філалагічных навук В. К. Аляшкевіч, І. К. Германовіч, І. А. Карабань, В. Ф. Кахно, А. Ф. Манаенкава, Л. А. Шаучэнка, А. І. Яновіч і іншыя. Побач з гэтымі асноунымі дысцыплінамі завочнікам чытаюцца спецкурсы па гісторыі славянскай лексікі (прафесар М. Г. Булахау), па культуры мовы (дацэнт С. О. Цаленчук). Узмацненню лінгвістычнай падрыхтоукі завочнікау садзейнічаюць таксама спецсемінары па рускай мове. Адзін з іх — па прабламе «Тэарэтычныя пытанні сінтаксісу сказа» — вядзе дацэнт В. Ф. Кахно — аутар навуковых прац у гэтай галіне і добры метадыст-практык.

Сур'ёзнае значэнне надаецца самастойнай падрыхтоуцы завочнікау па першакрыніцах. На жаль, многія завочнікі (нават мінчане) на экзаменах і заліках не паказваюць высокіх ведау па сваёй спецыяльнасці галоуным чынам таму, што не знаёмы з асноунай і дадатковай рэкамендаванай літаратурай. Ёсць значная частка студэнтау пасіуных, якія не праяуляюць ніякай цікавасці да новай вучэбнай літаратуры, амаль ніколі не заглядваюць у кнігу і прыязджаюць на экзамены не узбагачаныя новымі ведамі. Такім чынам яны, часам, даходзяць да шостага курса, а застаюцца па сутнасці на тым узроуні, на якім былі пры паступленні ва універсітэт. Дзіуна, што сярод завочнікау, якія самі працуюць настаунікамі у пачатковых і сярэдніх школах, сустракаюцца зусім непісьменныя людзі. У тэкстах іх сачыненняу можна знайсці шматлікія памылкі, якія абумоулены няведаннем элементарных правіл школьнай граматыкі: «гибчайший», «звончайший» (В. А. Логвінава); «судьев», «сапогов», «чулков» (Г. Е. Валынец); «сладее», «высочее», «широчее» (А. В. Доунар). У многіх студэнтау не хапае агульнай культуры, вузкі навуковы кругагляд, а гэта перашкаджае ім разумець самыя звычайныя з'явы і акружаючую рэчаіснасць. У кантрольнай рабоце аднаго студэнта-завочніка па рускай мове назоунікі «кенгуру» і «шымпанзе» былі аднесены да катэгорыі слоу, якія абазначаюць «географические названия». Трэба да усяго дадаць, што многія завочнікі не прад'яуляюць належнага патрабавання да сябе, адносяцца да сваёй вучобы аляякава, прысылаюць часта кантрольныя і курсавыя работы неахайныя, не па форме выкананыя і, што больш за усё прыкра, спісаныя з іншых крыніц (Папко, Лебедзева, Бурак і іншыя). Відаць, такія студэнты не жадаюць самастойна думаць і працаваць. Напэуна, самае галоунае для іх — як-небудзь атрымаць дыплом аб вышэйшай адукацыі. А, між тым, сучасны узровень развіцця нашага грамадства патрабуе ад людзей з вышэйшай адукацыяй самых высокіх ведау і адказнасці перад калектывам, дзе яны працуюць, перад людзьмі, якім неабходны іх адукацыя, дапамога і кірауніцтва.

**М. БУЛАХАЎ,**
**прафесар, загадчык кафедры рускай мовы,**
**Г. ПАПОВА, М. ПІПЧАНКА,**
**кандыдаты філалагічных навук.**

●

*Мабыць, няма зараз больш гарачага месца на завочным факультэце, чым канцылярыя.*

*На здымку: сакратар О. С. Жалезкіна за выкананнем неадкладных спрау.*

*Фота Д. Чаховіча.*

●



# НЯЛЁГКА, АЛЕ МОЖНА

Насуперак даволі распаусюджанаму меркаванню, што спецыяліст, які вучыуся на стацыянары, будзе больш падрыхтаваны, чым той, хто атрымау адукацыю завочна, я магу прывесці нямала прыкладау высокай кваліфікацыі менавіта былых завочнікаў.

Другая справа, што вучыцца па завочнай сістэме даволі цяжка. Для гэтага неабходна вялікае напружанне усіх сіл. І ўсе ж добра вучыцца і стаць добрым спецыялістам, канешне, можна. У якасці прыкладу прывяду наш цяперашні VI курс аддзялення журналістыкі. Колькасны склад яго вагауся у межах 40—45 чалавек. Узрост — да 35 год. Ужо некалькі год на гэтым курсе амаль няма хвасцістау. Усе студэнты вядуць вялікую і адказную работу. І. Грамыка, напрыклад, — сакратар райкома камсамола, І. Ганшураў — інструктар райкома партыі, Я. Хадкевіч — адказны сакратар раённай газеты, І. Міхайлау — нязменны староста курса — выхавацель падлеткаў у сістэме прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі і г. д.

Усе яны добра вучацца, і кожны яшчэ мае пастаяннае грамадскае даручэнне. Яны паспяваюць справіцца з такой нагрузкай дзякуючы таму, што цвёрда вызначылі свае жыццёвыя пазіцыі, умеюць правільна арыентавацца ў вытворчых абставінах і вялікім патоку інфармацыі, правільна размеркаваць бюджэт свайго часу і, галоўнае, умеюць прымусіць сябе працаваць. Вось што, па-мойму, патрэбна, каб добра спалучаць вучобу з працай.

Некалькі слоў аб самой завочнай сістэме адукацыі. На мой погляд, наспела неабходнасць перагледзець некаторыя пытанні выкладання. Напрыклад, лекцыі для завочнікау чытаюцца, як правіла, перад экзаменамі. А кантрольныя работы выконваюцца на 2—3 месяцы раней. Каб правільна іх выканаць, студэнт павінен знайсці ключ для раскрыцця тэмы. А ключ гэты даецца на лекцыях. Магчыма, было б мэтазгодней у зімовую сесію даваць больш лекцый, а ў летнюю — толькі практычныя і семінарскія заняткі. Лекцыя дапаможа працаваць самастойна, а на семінарскіх занятках адкрываецца вялікая магчымасць дзейснага ідэалагічнага выхавання студэнтау, набыцця навыкаў уступаць у палеміку, развіваць пачуццё аудыторыі, арыентавацца у патоку інфармацыі.

**М. ЦІВА,**
**ст. метадыст вучэбнага аддзела універсітэта.**

